## Страховая организация ОАСО «БАГАЧ»

Учетный номер плательщика: **100687009.** Вид экономической деятельности: 66030. Организационно-правовая форма: 1131.
Орган управления: 96220. Единица измерения: **тыс. руб.** Адрес: **г. Минск, ул. Лынькова, 19/1, 220104**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

| АКТИВЫ | Код строки | на 1 января 2014 года | на 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 7 841 368 | 7 239 846 |
| Нематериальные активы | 120 | 6 191 | 6 993 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 4 554 197 | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | 4 554 197 | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 20 431 | 20 431 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 59 762 | 53 134 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | 12 481 949 | 7 320 404 |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 251 336 | 162 592 |
| в том числе: материалы | 211 | 251 336 | 162 592 |
| незавершенное производство | 212 | - | - |
| прочие запасы | 213 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 220 | 19 644 | 50 163 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | - | - |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 139 869 | 12 815 |
| в том числе: резерв незаработанной премии | 241 | 131 830 | 10 409 |
| резервы убытков | 242 | 8 039 | 2 406 |
| другие технические резервы | 243 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 5 878 647 | 309 350 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 21 254 990 | 10 140 157 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | 27 544 486 | 10 675 077 |
| **БАЛАНС** | 300 | 40 026 435 | 17 995 481 |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 1 января 2014 года | На 31 декабря 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 534 495 | 4 534 495 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 590 494 | 503 151 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 9 359 838 | 4 983 113 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 2 441 218 | 922 414 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | 16 926 045 | 10 943 173 |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | 4 845 | 4 174 |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 7 170 718 | 2 404 042 |
| Резервы убытков | 502 | 1 163 297 | 699 965 |
| Другие технические резервы | 503 | - | - |
| Иные страховые резервы | 504 | - | - |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 17 565 | 71 062 |
| Гарантийные фонды | 506 | - | - |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | 8 356 425 | 3 179 243 |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | 445 819 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 1 505 331 | 2 737 105 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 2 040 | 1 355 |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | 1 507 371 | 3 184 279 |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 12 000 000 | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 236 594 | 599 622 |
| в том числе: страхователям | 631 | 41 223 | - |
| страховым агентам и брокерам | 632 | 426 717 | 21 092 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | 16 680 | 6 612 |
| по операциям перестрахования | 634 | 128 374 | - |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | - | - |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 56 374 | 19 063 |
| по авансам полученным | 637 | - | - |
| по налогам и сборам | 638 | 40 928 | 248 510 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 639 | 302 262 | 196 774 |
| по оплате труда | 640 | 154 955 | 80 332 |
| по лизинговым платежам | 641 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 642 | 26 565 | 13 921 |
| прочим кредиторам | 643 | 42 516 | 13 318 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 650 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 660 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 670 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 680 | - | 89 164 |
| **ИТОГО по разделу VI** | **690** | 13 236 594 | 688 786 |
| **БАЛАНС** | **700** | 40 026 435 | 17 995 481 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2013 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2013 года | За январь-декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто | 010 | - | - |
| Страховые выплаты | 020 | 2 174 916 | 116 106 |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -) | 030 | (671) | (578) |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | - | - |
| Расходы на ведение дела | 050 | - | - |
| Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 055 | - | - |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимися к страхованию жизни (строки 010 - 020 + 030 - 040 - 050 + 055 - 056)** | **060** | (2 175 587) | (116 684) |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто - всего | 070 | 16 378 735 | 6 947 207 |
| в том числе: по прямому страхованию и сострахованию | 071 | 13 039 172 | 6 331 879 |
| по рискам, принятым в перестрахование | 072 | 3 339 563 | 615 328 |
| Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто | 073 | 272 298 | 185 913 |
| Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073) | 074 | 16 106 437 | 6 761 294 |
| Изменение резерва незаработанной премии, брутто | 080 | (4 766 676) | (1 099 776) |
| Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии | 081 | 121 421 | (6 753) |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081) | 082 | (4 645 255) | (1 106 529) |
| Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082) | 085 | 11 461 182 | 5 654 765 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто | 090 | 5 175 981 | 3 173 393 |
| Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах) | 091 | 4 930 | 30 032 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091) | 092 | 5 171 051 | 3 143 361 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто | 095 | (463 332) | (378 358) |
| Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат) | 096 | 5 633 | 390 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с у четом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096) | 097 | (457 699) | (377 968) |
| Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097) | 100 | 5 832 432 | 2 133 436 |
| Изменение других технических резервов | 110 | - | - |
| Изменение иных страховых резервов | 120 | - | - |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 130 | 9 504 | 6 332 |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 140 | - | - |
| Расходы на ведение дела, всего | 150 | 5 616 782 | 2 852 763 |
| в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 151 | 341 444 | 68 955 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 155 | 22 159 | 29 325 |
| Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 160 | - | - |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 165 | - | - |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (строки 100 + 110 + 120 - 130 - 140 - 150 + 155 + 160 - 165)** | **170** | 228 305 | (696 334) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 180 | 609 078 | 635 243 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 181 | 380 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 182 | 976 | 51 |
| проценты к получению | 183 | 581 092 | 635 192 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 184 | 26 630 | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 190 | 2 098 | 238 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 191 | 311 | 238 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 192 | 1 787 | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 200 | 4 753 263 | 5 510 835 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 201 | 4 753 263 | 5 510 835 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 202 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 210 | 2 309 919 | 4 083 264 |
| в том числе: проценты к уплате | 211 | - | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 212 | 2 309 919 | 4 083 264 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 213 | - | - |
| Иные доходы | 220 | 2 100 610 | 718 454 |
| Иные расходы | 225 | 1 309 383 | 765 461 |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (строки 180 - 190 + 200 - 210 + 220 - 225)** | **230** | 3 841 551 | 2 015 569 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода (строки ± 060 ± 170 ± 230) | 240 | 1 894 269 | 1 202 551 |
| Налог на прибыль | 250 | 323 643 | 322 730 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 260 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 270 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 280 | - | - |
| Отчисления во внебюджетный централизованный инвестиционный фонд в соответствии с указом Президента РБ от 07.08.2012 №357 | 281 | - | - |
| **Чистая прибыль (убыток) (строки ± 240 - 250 ± 260 ± 270 - 280 - 281)** | **290** | 1 570 626 | 879 821 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 300 | 4 376 725 | 1 331 221 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 310 | - | - |
| **Совокупная прибыль (убыток) (строки ± 290 ± 300 ± 310)** | **320** | 5 947 351 | 2 211 042 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 330 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 340 | - | - |

***Руководитель*** ***А.Н. Чайчиц*** ***Главный бухгалтер*** ***В.В. Дик***

Аудитор, индивидуальный предприниматель Волчкова Алина Константиновна; УНП 100961335, свидетельство № 0067877 от 4.03.2002 г. выдана администрацией Заводского района г. Минска, квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.2003 года выданный Министерством финансов РБ, полагает, что проведенный аудит дает достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «БАГАЧ», сформированной в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражения финансового положения ОАСО «БАГАЧ» на 01 января 2014 г. и результатах его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 г., при этом совершенные ОАСО «БАГАЧ» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.


**НАРОДЖАНЫЯ 22 сакавіка**

**Яны перакананы ў асабістай непагрэшнасці і не церпяць пярэчанняў. Якая б мэта ні была пастаўлена, яны абавязкова яе дасягнуць. Народжаныя ў гэты дзень з пагардай ставяцца да любой формы прытворства, няшчырасці і нядобрасумленнасці. Людзі гэтага дня маюць рэпутацыю ў найвышэйшай ступені надзейных асоб. Яны адчуваюць задавальненне ад кар'еры, калі здольны крытычна ацэньваць вынікі сваёй працы. І яшчэ: ім неабходна чуйна ўлоўліваць імкненні да дэспатызму і тыраніі, якія наспяваюць у душы. Шлях да поспеху — развіццё ў сабе дыпламатычнасці і пераадоленне замкнёнасці, спагадлівасць да тых, хто не вылучаецца такой мэтанакіраванасцю, як яны.**

**НАРОДЖАНЫЯ 23 сакавіка**

**Пытанні жыцця і смерці, маладосці і старасці, асноўныя чалавечыя эмоцыі — вось што выклікае ў іх вялікую цікавасць. Яны не прымуць невыпрабаванай ідэі або канцэпцыі, ды і самі не будуць аперыраваць недакладнымі звесткамі і фактамі, яны робяць высновы толькі на базе асабістых назіранняў. Народжаныя ў гэты дзень — асобы вельмі разнастайныя, кола іх інтарэсаў не абмяжоўваецца якой-небудзь адной з названых сфер. Як правіла, яны адчуваюць асаблівую прыхільнасць і сапраўдную любоў да дзяцей, хоць у аснове ляжыць навуковы падыход, а зусім не пошук душэўнага камфорту. Вось чаму яны з такім захапленнем вывучаюць навакольных і пры гэтым застаюцца эгаістамі ў асабістым жыцці.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Паспрабуйце быць больш уважлівымі і не дапускаць памылак, інакш калегі абвінавацяць вас ва ўсіх смяротных грахах. Думкі стануць выразнымі і дакладнымі, што паспрыяе зараджэнню мноства ідэй, якія неабходна падзяліць на рэальныя і ілюзорныя. У чацвер будуць удалымі любыя паездкі. Спатрэбіцца надзейнасць і дзелавая хватка: яны дазволяць у любой сітуацыі паспяхова супрацьстаяць апанентам.

**ЦЯЛЕЦ.** Пачатак тыдня будзе надзвычай спрыяльным для бізнесу. Сачыце за сабой падчас гутаркі: нават адно неасцярожнае слова лёгка можа быць выкарыстана супраць вас. І не забывайце, што, калі прымаеце якія-небудзь рашэнні, надзвычай карысна старанна іх абдумваць. Пры гэтым у пятніцу сур'ёзных рашэнняў лепш наогул не прымаць. Калі ў суботу ці ў нядзелю сябры прапануюць вам адправіцца на прыроду, то не адмаўляйцеся ад паездкі: яна можа аказацца вельмі прыемнай.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тое, у што вамі ўкладвалася так шмат сіл і ў што вы так верылі, на гэтым тыдні нарэшце прынясе адчувальны вынік. Увесь тыдзень будзе спрыяльны для рашучых дзеянняў, любыя распачынанні і новыя справы маюць шанц ажыццявіцца. Нягледзячы на прафесійную занятасць, не варта пакідаць свой дом без увагі. Зрэшты, энергіі вам хопіць нават на рамонт з абнаўленнем інтэр'еру, а вось часу можа і не хапіць. У сярэдзіне тыдня асцерагайцеся прымаць удзел у авантуры (ёсць рызыка страціць значна больш, чым набыць) і не выпускайце канкурэнтаў з поля зроку.

**РАК.** Падзеі могуць прайсці лавінай, змятаючы ўсё на сваім шляху. У сувязі з гэтым будзьце гатовы да аднаўленчых і рамонтных работ або да добраўпарадкавання ландшафту, які змяніўся. Абавязкова прадумайце свой расклад і падыдзіце да змен, якія адбываюцца, сур'ёзна. Вас будзе чакаць мноства навін, дзелавых сустрэч, напружаных сітуацый на працы.

**ЛЕЎ.** Змены ў жыцці, якія даўно наспявалі, нарэшце павінны адбыцца. Верагодны спрыяльны збег акалічнасцяў для адкрыцця новай справы. Не ўскладайце вялікіх надзей на дапамогу іншых, але, калі яе вам прапануюць, не адмаўляйцеся. Не губляйце каштоўны час. Калі ўжо вырашылі штосьці зрабіць, то дзейнічайце адразу.

**ДЗЕВА.** Паспрабуйце пазбягаць бескарыснай мітусні і не бярыцеся за ўсе справы адначасова, бо рызыкуеце наступіць на знаёмыя граблі. Лепш за ўсё спакойна займіцеся сваімі асабістымі справамі. Другая палова тыдня можа прынесці пэўныя змены, для чаго, магчыма, спатрэбіцца дапамога вашых калег па працы. Не адмаўляйцеся ад яе, а прыміце з удзячнасцю.

**ШАЛІ.** Для вас надыходзіць выдатны час, павінна многае атрымлівацца, таму паспрабуйце выкарыстоўваць яго максімальна рацыянальна. Прыцягвайце новых дзелавых партнёраў, праяўляйце таварыскасць і актыўнасць. Гэта дазволіць умацаваць становішча і падумаць пра жаданую перспектыву. Найбольш спрыяльныя дні тыдня — аўторак і субота, а вось пятніца можа аказацца няўдалай.

**СКАРПІЁН.** Будзьце больш паблажлівымі да сябе, не патрабуйце вельмі шмат. Незадаволенасць сабой крыху зменшыць радасць ад поспеху, нягледзячы на тое, што тыдзень абяцае быць удалым амаль ва ўсім. Верагодная далёкая паездка, якая акажацца на рэдкасць плённай. Толькі не забудзьцеся давесці да ладу свае дакументы, каб гэта не стала перашкодай. Давядзецца праявіць упартасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў.

**СТРАЛЕЦ.** У прафесійнай сферы спатрэбіцца пільная ўвага. Для таго, каб утрымліваць сітуацыю пад кантролем, выкарыстоўвайце разважлівасць і ўменне выконваць працу своечасова. Пазбягайце сварак і паспрабуйце не праяўляць ганарыстасць. У чацвер максімальная актыўнасць і рашучыя дзеянні прынясуць плён.

**КАЗЯРОГ.** Будзеце здольныя разабрацца ў шматлікіх заблытаных справах і давесці іх да лагічнага канца, у сувязі з чым можаце разлічваць на заслужаную грашовую ўзнагароду. У сераду вас могуць заваліць тэрміновымі, але дробнымі справамі. У пятніцу чакайце цікавай прапановы, якая станоўча паўплывае на дабрабыт. Нягледзячы на занятасць, будзе нядрэнна, калі ў выхадныя атрымаецца ўспомніць пра дом і сям'ю.

**ВАДАЛЕЙ.** Можаце дасягнуць вялікіх поспехаў пры рашэнні імгненных задач. Але пры гэтым пазбягайце паспешнасці, рабіце ўсё паслядоўна. Доўгачаканыя змены не наступяць без рашучых дзеянняў. Працягвайце шукаць новыя знаёмствы: яны могуць адыграць важную ролю ў вашым жыцці. У сераду будзьце ўважлівей з інфармацыяй, якая прыйдзе здалёку, і пазбягайце імгненных высноў.

**РЫБЫ.** Тыдзень можа аказацца досыць клапатлівым, таму ў першую чаргу займіцеся абавязковымі справамі, адклаўшы на час усе астатнія. Дзеянні кіраўніцтва не крытыкуйце і не абмяркоўвайце: вас могуць няправільна зразумець, што дрэнна адаб'ецца на рэпутацыі.

Даты | Падзеі | Людзі

***Сусветны дзень водных рэсурсаў. Адзначаецца па рашэнні ўдзельнікаў Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці, якая адбылася ў Рыа-дэ-Жанэйра ў чэрвені 1992 г., з мэтай прыцягнуць увагу сусветнай грамадскасці да праблемы недабраякаснай пітной вады. Генасамблея ААН абвясціла перыяд 2005–2015 гг. Міжнародным дзесяцігоддзем дзеянняў «Вада для жыцця».***

**1915** год — у Пецярбургу ў сям'і пекара нарадзіўся Георгій Жжонаў, рускі акцёр, народны артыст СССР. Жжонаў пражыў жыццё, якое можна назваць люстэркам рускай гісторыі ХХ стагоддзя. Першы фільм, дзе ён выканаў адну з галоўных роляў, быў «Камсамольск». Але адразу ж пасля здымак Георгія Сцяпанавіча арыштавалі. Арышт нават адклалі на дзень, каб можна было завяршыць карціну. У 22 гады лёс кінуў яго, маладога акцёра, у мясарубку сталінскіх рэпрэсій. Але ён не страціў веру ў сябе, у жыццё, у сапраўдных людзей. Толькі ў 40 гадоў Жжонаву ўдалося вярнуцца да любімай справы. Усе памятаюць і любяць яго герояў — шпіёна Тульева ў фільме «Памылка рэзідэнта», сумленнага міліцыянера ў карціне «Беражыся аўтамабіля», аўтарытэтнага генерала ў «Гарачым снезе». А колькі вобразаў створана на тэатральнай сцэне! «Пра тое, што здарылася са мной у жыцці, я не шкадую, — казаў Георгій Сцяпанавіч. — Усё, што я адчуў, спатрэбілася ў прафесіі…».



**1943** год — дзень трагедыі Хатыні і яе жыхароў. Загінулі 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. У жывых засталіся толькі пяцёра дзяцей і адзін дарослы — Іосіф Камінскі. Страшны лёс знішчэння разам з Хатынню падзялілі 9200 са 100 тысяч сёл і вёсак Беларусі. Некаторыя з іх, спаленыя разам з людзьмі, як і Хатынь, пасля вайны ўжо не былі адноўлены. Хатынскія званы заклікаюць: «Памятайце, людзі!» У 1969 годзе на месцы вёскі збудаваны мемарыяльны комплекс у памяць аб ахвярах фашызму ў Беларусі. Архітэктары — Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін, скульптар — Сяргей Селіханаў.

**1939** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Блудзень Бярозаўскага раёна) Аляксандр Пятровіч Барушка, беларускі вучоны ў галіне кіравання энергетыкай, доктар тэхнічных навук (1993). У 1961 годзе скончыў БПІ. Працаваў намеснікам галоўнага інжынера Белэнерга, загадчыкам аддзела ў Беларускім аддзяленні Усесаюзнага навукова-даследчага і праектнага інстытута энергетычнай прамысловасці, у Дэпартаменце па тэхнічным супрацоўніцтве ААН. З 1995 года — у БНТУ. Аўтар навуковых прац па пытаннях кіравання якасцю і надзейнасцю ў энергетыцы, павышэнню безадказнасці, рамонтапрыдатнасці і гатоўнасці ў энергасістэмах.

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**

*«Чалавеку цяжка перарабіцца адразу. Можна думаць і гаварыць іначай, а сам чалавек доўга будзе ранейшым».*

## ГАРНІСТ НА РАТУШЫ

**Сімвалічная постаць з'явіцца на балконе прадстаўнічага будынка мясцовага самакіравання часоў Магдэбургскага права ў Магілёве.**

Ідэя належыць Генадзю Галоўчыку, майстру гадзінніка, размешчанага на будынку музея гісторыі Магілёва. Ён створыць механізм, дзякуючы якому гарніст будзе выязджаць у пэўны час пад гук фанфар. Плануецца, што гэты гістарычны персанаж упрыгожыць будынак напярэдадні святкавання Дня Незалежнасці. А вось самога гарніста збіраецца стварыць з металу вядомы магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў. На стварэнне незвычайнай канструкцыі плануецца расходаваць каля 100 мільёнаў рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Салата «Букет руж»

Загадзя выпякаем некалькі тонкіх блінцоў для руж.

***Для блінцоў спатрэбіцца:*** *0,5 л кефіру (сыроваткі ці ражанкі), а лепш за ўсё кіслага цэльнага малака; 2 ст.л. цукру; 1 ч.л. солі; 1 ч.л. харчовай соды, гашанай 1 ст.л. воцату; 14 ст.л. мукі.*

Усё добра вымешаць венцам да атрымання аднароднай масы і дадаць 300–350 г кіпеню. Заліваць ваду ў цеста трэба тонкім струменьчыкам, увесь час вымешваючы венцам да атрымання патрэбнай кансістэнцыі.

Вады можа пайсці і трохі больш. Усё залежыць ад якасці мукі: чым больш клейкавіны — тым больш мука возьме вады. Адразу можна выпякаць. Алей у цеста ліць не трэба, бо тады яно робіцца цяжкім і блінцы не атрымліваюцца ажурнымі (у дзірачку). Па меры набракання клейкавіны ў муцэ магчыма давядзецца дадаваць у цеста трохі кіпячонай вады падчас выпякання. Блінцы атрымліваюцца тоненькія, эластычныя і вельмі смачныя.



***Для салаты спатрэбіцца:*** *1 селядзец, 2 бульбіны, 1 бурак, 2 сярэднія марынаваныя агурочкі.*

Гародніну адварваем паасобку, астуджаем. Салата робіцца слаямі.

1 слой — філе селядца кавалачкамі;

2 — бульба, надзёртая на буйной тарцы;

3 — агурочкі, парэзаныя кубікамі (не любіце агурочкі — замяніце на моркву, тады атрымаецца звычайны селядзец пад футрам);

4 — бурак, надзёрты на буйной тарцы.

Кожны пласт прамазваем маянэзам.

***Начынка для блінцоў:*** *1 бурак, 100 г сыру, 3 зубчыкі часнаку, пара блінцоў.*

Надзіраем бурак і сыр на дробнай тарцы, змешваем, дадаём маянэз і часнок, прапушчаны праз прэс. Колькасць інгрэдыентаў бярыце на смак: хтосьці вострае любіць, хтосьці — не вельмі. Намазваем гэтай масай блінцы густа, згортваем рулет, наразаем яго папярок на невялікія рулецікі. Ружы гатовы. Укладваем зверху салаты ружы-рулецікі, акуратна распраўляючы іх краі, упрыгожваем букет свежай зелянінай.

Можна проста выкласці ружы на блюда ў выглядзе букета ў якасці самастойнай закускі.

ВЕСНАВЫЯ КЛОПАТЫ

## Як захоўваць бярозавік?

**Калі вы не хочаце піць сок адразу, а збіраецеся захаваць яго даўжэй, заліце яго ў шкляны слоік і пастаўце ў халадзільнік. Так напой будзе менш акісляцца — а значыць, псавацца. Аднак даўжэй чым 2–3 дні сок лепш не захоўваць. Але калі закансерваваць сок, то ён прастаіць яшчэ некалькі месяцаў.**



Бярозавік сам па сабе прыемны, асвяжальны напой, які ўмацоўвае арганізм. У яго можна дадаваць сок чарнаплоднай рабіны, брусніц, чарніц ці настойваць на розных травах (чаборы, рамонку, кмене, кветках ліпы, пладах шыпшынніка) у слоіку, накрытым марляй, прыкладна 2 тыдні. Можна дадаваць да яго настоі святаянніка, мяты, мелісы, сасновай ігліцы, сок вішні, яблыкаў, парэчкі. Нашы продкі пілі бярозавік, закіслы ў бочках без дадання цукру, — гэта быў традыцыйны слабаалкагольны напой.

✓ Свежы бярозавік збраджваюць у шкляных ёмістасцях любога аб'ёму. Прамыўшы гарачай (лепш кіпенем) вадой, іх напаўняюць свежым сокам. На кожныя паўлітра дадаюць па няпоўнай чайнай лыжцы звычайнага ці глюкознага цукру, 2–3 разыначкі і, калі падабаецца, — трохі лімоннай цэдры. Ёмістасць закрываюць коркам ці вечкам і замацоўваюць дротам. Ціск вуглякіслага газу пры закісанні ствараецца даволі высокі, і, каб шкло не лопнула, класці больш паказанай колькасці цукру не рэкамендуецца. Праз некалькі дзён вы атрымаеце прыемны на смак, кіславаты, моцна газаваны напой.



✓ Для кансервавання сок падагрэйце ў эмаліраваным посудзе да тэмпературы 80 градусаў. Разліце па шкляных бутэльках і слоіках. Запоўніце амаль даверху і закаркуйце. Затым вытрымайце 15–20 хвілін у вадзе 85 градусаў для пастэрызацыі.

✓ Бярозавік можна метадам выпарвання згусціць да сіропу, які змяшчае 60% цукру. Такі сіроп мае цытрынава-белы колер і гушчыню мёду.

*(Як яшчэ можна перапрацаваць бярозавік для захоўвання, чытайце ў наступным выпуску.)*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.08 | 19.27 | 12.19 |
| Віцебск — | 6.57 | 19.17 | 12.20 |
| Магілёў — | 6.58 | 19.17 | 12.19 |
| Гомель — | 6.55 | 19.13 | 12.18 |
| Гродна — | 7.23 | 19.42 | 12.19 |
| Брэст — | 7.24 | 19.42 | 12.18 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 24 сакавіка. Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Наталлі, Валерыя, Дзмітрыя, Ільі, Мікалая, Пятра, Рыгора.*
***К.*** *Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Хочаце пераспрачаць жанчыну? Спачатку пераспрачайце аўтамабільны навігатар.

**— Дачушка, будзеш чай?**
**— Не.**
**— А я буду, ідзі завары!**

А нельга неяк больш сціпла кашэчы корм называць? Чаму мой кот есць «Рагу з труса ў сметанковым соусе», а я макароны з сасіскамі?

**— Хто для цябе бліжэй — Дон Жуан ці Дон Кіхот?**
**— Дон Перыньён.**

Высвятляла з мужам адносіны. Ахрыпла. Паглядзела — а ён аглух! Перайшла на жэсты. Страціў прытомнасць. Слабак!





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1143.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12